# § 30. Фарміраванне беларускай народнасці

НАРОДНАСЦЬ РУСІНЫ
БЕЛАЯ РУСЬ ТЭРЫТОРЫЯ МОВА
ПАЛЕШУКІ САМАСВЯДОМАСЦЬ
САМАНАЗВА ЛІТВА БЕЛАРУСЦЫ
АДЗІНСТВА ПАХОДЖАННЯ
ПСІХАЛАГІЧНЫЯ РЫСЫ
КУЛЬТУРА РЭЛІГІЯ ЛІТВІНЫ

**Фарміраванне беларускай народнасці**

Успомніце, як ажыццяўлялася засяленне тэрыторыі Беларусі. Якія славянскія саюзы плямёнаў склаліся ў VIII–IX стст.?

**1. Умовы фарміравання беларускай народнасці.** У XIII–XIV стст. ва Усходняй Еўропе сфарміраваліся два цэнтры «збірання» зямель Старажытнай Русі — Вялікае Княства Літоўскае і Маскоўскае княства. Адначасова з развіццём новых дзяржаў адбываўся працэс фарміравання некалькіх усходнеславянскіх этнасаў, адным з якіх з'яўлялася беларуская народнасць. Старажытнаруская спадчына на працягу доўгага часу адыгрывала значную ролю ў жыцці ўсходнеславянскіх народаў.

### ЭТАПЫ РАЗВІЦЦЯ ЭТНАСУ

Род ▶ Племя ▶ Народнасць ▶ Нацыя

**Народнасць** — устойлівая супольнасць людзей, якая характарызуецца адзінствам паходжання, адзінай мовай, тэрыторыяй, эканамічным жыццём і культурай, псіхічным складам (характарам), этнічнай самасвядомасцю.

**Народнасць** утвараецца ў працэсе зліцця плямёнаў і папярэднічае нацыі. Працэс фарміравання беларускай народнасці быў даволі працяглы — *з канца XIII да XVI ст.* — і адбываўся пад уплывам грамадска-палітычных, сацыяльна-эканамічных, рэлігійных, а таксама агульных этнакультурных тэндэнцый, уласцівых усёй еўрапейскай цывілізацыі таго часу.

### Складванне этнічнай тэрыторыі

Тэрыторыя, на якой сфарміравалася беларуская народнасць, склалася да XVI ст. Паўночная мяжа этнічных земель, дзе беларусы суседнічалі з прадстаўнікамі балцкіх этнасаў, амаль цалкам супадала з дзяржаўнай мяжой ВКЛ з Лівонскім ордэнам, пскоўскімі і наўгародскімі землямі. На захадзе мяжа праходзіла па Заходнім Падляшшы, дзе разам з беларусамі жылі палякі, літоўцы і яцвягі. Паўднёвая мяжа пралягала па Палессі, дзе на этнічныя працэсы ўплывалі кантакты з украінскім народам, які фарміраваўся. Найбольш мянялася ў XIV–XVI стст. мяжа на ўсходзе. У перыяд максімальнага пашырэння ВКЛ у працэс фарміравання беларускай народнасці былі ўцягнуты тэрыторыі Браншчыны і Смаленшчыны. У другой палове XVII ст. этнічная мяжа на ўсходзе наблізілася да сучаснага стану.

Прасачыце на карта-схеме «Вялікае Княства Літоўскае ў канцы XV ст.», змешчанай на форзацы, працэс фарміравання этнічнай тэрыторыі.

### Фактары, якія паўплывалі на фарміраванне беларускай народнасці

Вырашальным у фарміраванні беларускай народнасці было аб'яднанне ўсіх беларускіх зямель у межах адной дзяржавы — Вялікага Княства Літоўскага.

Важным аб'яднаўчым фактарам было развіццё гаспадаркі, пашырэнне сухапутных шляхоў, што спрыяла развіццю гандлёвых сувязей паміж рознымі рэгіёнамі Беларусі. У выніку складваліся агульныя рысы гаспадарчай дзейнасці. У XVI ст. канчаткова аформілася саслоўная структура беларускага грамадства, вылучыліся саслоўі шляхты, духавенства, мяшчанства і сялянства.

Важную ролю ў працэсе фарміравання беларускай народнасці адыграў і канфесійны фактар. Да сярэдзіны XVI ст. большасць насельніцтва ВКЛ была праваслаўнай, што спрыяла кансалідацыі этнасу. Аднак паступовае пашырэнне ўплыву каталіцкай царквы, асабліва сярод магнатаў і шляхты, развіццё пратэстанцкага руху, а затым і Контррэфармацыя адмоўна паўплывалі на фарміраванне ўласнай этнічнай эліты.

Саманазвы беларусаў: «русіны», «літвіны», «беларусцы»

**Этнічная самасвядомасць** — разуменне сваёй прыналежнасці да таго ці іншага этнасу.

**2. Фарміраванне этнічнай самасвядомасці.** Найважнейшай прыкметай народа з'яўляецца **этнічная самасвядомасць.** Яе вонкавай формай выступае *саманазва*. У перыяд складвання беларускай народнасці ў XIV–XVI стст. большая частка жыхароў сучаснай Беларусі, незалежна ад саслоўнай прыналежнасці, называла сябе *«русь», «русіны», «рускія»*. Аднак такую назву актыўна ўжывалі і рускія, і ўкраінцы, што было абумоўлена гістарычнай памяццю пра Старажытнарускую дзяржаву і значным уплывам на грамадства праваслаўнай царквы.

Прадстаўнікі кожнага з этнасаў лічылі сапраўднымі «рускімі» толькі сябе, а суседзям давалі іншыя назвы. Беларускія «русіны», напрыклад, сённяшніх рускіх называлі «пскавічамі», «наўгародцамі», «маскавітамі», а ўкраінцаў — «валынянамі», «казакамі» і г. д. Жыхароў жа Беларусі іншыя народы называлі *«літвінамі»*. Гэты тэрмін аказаўся вельмі мнагазначны. Так называлі балцкае (літоўскае) насельніцтва ВКЛ, літвінамі лічылі сябе прадстаўнікі каталіцкай шляхты, гэтая назва замацавалася і за жыхарамі заходніх зямель Беларусі і ўсходу Літвы. Тэрмін «літвіны» выкарыстоўваўся таксама ў якасці агульнага наймення жыхароў ВКЛ незалежна ад іх этнаканфесійнай прыналежнасці.

У другой палове XVI ст. узнік тэрмін *«беларусец»*, які атрымаў вялікае распаўсюджанне ў Расійскай дзяржаве для абазначэння праваслаўнага насельніцтва ВКЛ. Узнікненне гэтага этноніма шчыльна звязана з пашырэннем геаграфічнай назвы «Белая Русь», пад якой у XVI–XVII стст. разумелі паўночна-ўсходнюю частку ВКЛ — Полаччыну, Віцебшчыну і Смаленшчыну, а затым і Падняпроўе. За заходняй часткай сучаснай Беларусі ў XVI–XVII стст. замацавалася назва Літва.

Мясцовыя і рэгіянальныя саманазвы

Адначасова з этнічнымі саманазвамі існавалі і мясцовыя назвы *(«палачанін», «пінчук», «тураавец»)*, якія, як правіла, азначалі прыналежнасць да

## ВЕРСІІ ПАХОДЖАННЯ НАЗВЫ «БЕЛАЯ РУСЬ»




Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, пашырце пералік версій паходжання назвы «Белая Русь».

населенага пункта, пэўнай мясцовасці. Існавалі і рэгіянальныя назвы — так, напрыклад, за жыхарамі Палесся замацаваўся тэрмін *«палешукі»*.

### ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

У 1586 г. шляхціц Саламон Рысінскі, родам з Полаччыны, першы з сучаснікаў выкарыстаў тэрмін «беларус» для абазначэння сваёй этнічнай прыналежнасці. Аднак гэта не было заўважана яго сучаснікамі.

Пазнаёмцеся з біяграфічнымі звесткамі пра жыццё і дзейнасць Саламона Рысінскага і адкажыце на пытанні:

*1. Пры якіх абставінах ён назваў сябе беларусам?*
*2. Як вы лічыце, чаму гэтая падзея не была заўважана яго сучаснікамі?*

**Фарміраванне старабеларускай мовы**

**3. Старабеларуская мова.** Фарміраванне беларускай народнасці праявілася ў збліжэнні разнастайных мясцовых дыялектаў і стварэнні на іх аснове старабеларускай мовы.

Да XVI ст. у мове беларусаў ужо сфарміраваліся такія асаблівасці, як «аканне» і «яканне», «дзеканне» і «цеканне». Мова папаўнялася новымі словамі, якія адлюстроўвалі розныя бакі палітычнага, сацыяльна-эканамічнага і культурна-рэлігійнага

## СПЕЦЫФІЧНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ СТАРАБЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

| | | | |
|---|---|---|---|
| **«Аканне»** (вада, нага) | **«Дзеканне»** (дзеці, дзяржава) | **Гукі й, ў** (гай, воўк) | **Прыстаўныя гукі** (восень, вобраз) |
| **«Яканне»** (вясна, зямля) | **«Цеканне»** (цётка, жыццё, цень) | **Фрыкатыўны «г»** (галава) | **Зацвярдзелыя гукі** (бяроза, дождж) |

Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, вызначце паходжанне слоў: «чынш», «бровар», «фальварак».

жыцця, — назвы феадальных павіннасцей, службовых асоб і органаў дзяржаўнай улады, заняткаў насельніцтва і інш. У лексіку траплялі запазычанні з іншых моў: напрыклад, слова «праца» прыйшло з польскай, «дойлід» — з літоўскай, а «дах» — з нямецкай мовы.

Развіццю старабеларускай мовы спрыяла тое, што ў XIV–XVII стст. яна была дзяржаўнай мовай Вялікага Княства Літоўскага. Яе выкарыстоўвалі судовыя ўстановы, княжацкая канцылярыя, магістраты, на ёй пісалі законы, стваралі літаратурныя творы. Яе ўжыванне ў афіцыйным справаводстве было заканадаўча замацавана Статутам 1588 г. Пазіцыі старабеларускай мовы ў ВКЛ у XIV–XVI стст. былі настолькі моцныя, што на яе пастунова перайшла значная частка татарскага этнасу, які жыў у ВКЛ. Да нашага часу дайшлі *кітабы* — рэлігійныя кнігі беларускіх татараў, напісаныя на старабеларускай мове арабскім пісьмом. Ф. Скарына выдаў на старабеларускай мове Біблію. Праходзіў працэс «абеларушвання» царкоўнаславянскай мовы, якой карысталася праваслаўная царква. Рэфармацыя садзейнічала пранікненню мовы ў канфесійную літаратуру. Яе захаванню спрыяла ўніяцкая царква, якая выкарыстоўвала мову карэннага этнасу разам з царкоўнаславянскай і лацінскай.




*Тытульны аркуш з Біблії Ф. Скарыны. Прага. 1519 г.*

Як вы лічыце, чаму на тытульнай старонцы Біблії Ф. Скарыны напісана «Бивлия Руска»?

У сувязі з працэсам паланізацыі беларускай шляхты сфера ўжывання старабеларускай мовы паступова звужалася, а пасля выдання соймавых пастаноў 1697 г. мова наогул знікла са справаводства, саступіўшы месца польскай. Тым не менш беларуская мова працягвала існаваць у жывым маўленні большасці насельніцтва Беларусі — сялянства, мяшчанства і дробнай шляхты, стварыўшы базу для фарміравання сучаснай беларускай мовы.

Звужэнне сферы ўжывання старабеларускай мовы

**4. Паўсядзённае жыццё насельніцтва Беларусі. Адзінства матэрыяльнай і духоўнай культуры беларускай народнасці.** У перыяд фарміравання беларускай народнасці развіваліся і замацоўваліся спецыфічныя рысы матэрыяльнай і духоўнай культуры беларусаў. Прыродна-кліматычныя і сацыяльна-эканамічныя фактары прадвызначылі кірункі гаспадарчай дзейнасці, характар жылля і гаспадарчых пабудоў.

Асаблівасці жылля

Асноўная маса насельніцтва жыла ў драўляных двухсхільных дамах з двума або трыма памяшканнямі, якія ацяпляліся глінабітнай печчу без коміна. Дамы знаці і заможных мяшчан былі адна- або двухпавярховыя, з зашклёнымі вокнамі, дашчанай падлогай, ацяпляліся печамі.

Тыпы паселішчаў

Асноўнымі тыпамі паселішчаў былі *вёскі* і *гарады*, з XV ст. — *мястэчкі*. У сувязі з правядзеннем «валочнай памеры» з'явіліся *фальваркі*, якія былі цэнтрамі феадальнай гаспадаркі, *засценкі* і *ваколіцы* — невялікія паселішчы дробнай шляхты, *слабоды* і *вулькі* — паселішчы сялян, надзеленых пэўнымі прывілеямі. Магнаты жылі ва ўласных замках, якія з цягам часу ператвараліся ў палацава-паркавыя ансамблі.

Адзенне беларусаў

Адзенне беларусаў было пераважна саматужнай вытворчасці, яго асобныя элементы багата ўпрыгожвалі арнаментам. Сярод шляхты ад XVI ст. пачаў пашырацца своеасаблівы «сармацкі строй», а сярод магнатаў — заходнееўрапейскае адзенне.

**Асаблівасці нацыянальнай кухні**

Аснову нацыянальнай кухні, якая фарміравалася на працягу стагоддзяў, складалі мучныя і крупяныя стравы, малочная прадукцыя, гародніна, рыба, мясныя вырабы. Ад XVI ст. народная кухня папоўнілася рознымі супамі. Ежа заможнага насельніцтва вылучалася большай далікатнасцю, разнастайнасцю прадуктаў і спецый, у тым ліку экзатычных.

**Духоўная культура беларусаў**

Матэрыяльнае жыццё беларусаў было шчыльна звязана з духоўнай культурай, якая асабліва яскрава праяўлялася ў народных святах і абрадах. Папулярнымі жанрамі фальклору былі песні, казкі, загадкі, прыказкі і прымаўкі. Сярод песень асаблівае месца займалі абрадавыя, шчыльна звязаныя з паўсядзённым жыццём і гаспадарчай дзейнасцю.

Танцавальнае мастацтва беларусаў пачаткова фарміравалася ў сялянскім асяродку. Сярод народных танцаў найбольш пашыраным быў карагод. Песні і танцы суправаджаліся ігрой на музычных інструментах — гуслях, рогу, дудках, трубе. У перыяд Новага часу з'явіліся новыя інструменты — дуда, цымбалы, ліра.

## ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

Культура беларускай дуды ўключана ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.




1. *Як вы лічыце, што маецца на ўвазе пад культурай беларускай дуды?*
2. *Высветліце, у чым унікальнасць гэтага музычнага інструмента.*
3. *Як завецца чалавек, які добра грае на дудзе? Успомніце, які беларускі паэт меў такі псеўданім.*
4. *Калі б вас папрасілі падрыхтаваць зварот-дасье ў ЮНЕСКА аб уключэнні дуды ў Спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны чалавецтва, якія б аргументы вы прывялі?*

*У канцы XIII — XVI ст. адбываўся працэс фарміравання беларускай народнасці. Паступова складваліся характэрныя яе прыкметы: старабеларуская мова, тэрыторыя, эканамічнае жыццё, матэрыяльная і духоўная культура, этнічная самасвядомасць. Асаблівасці фарміравання беларускай народнасці былі абумоўлены ўплывам розных фактараў: прыродна-геаграфічных, сацыяльна-эканамічных, палітычных, канфесійных.*

| калі ў свеце... | на тэрыторыі Беларусі... |
|---|---|
| XIII–XVI стст. — працэс фарміравання народнасцей у дзяржавах Еўропы | Канец XIII — XVI ст. — працэс фарміравання беларускай народнасці |

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Ахарактарызуйце прыкметы беларускай народнасці, якая фарміравалася ў канцы XIII — XVI ст.
2. Якія фактары паўплывалі на фарміраванне беларускай народнасці? Якія з іх паспрыялі станаўленню беларускага народа, а якія стрымлівалі яго развіццё?
3. Выкарыстоўваючы воблака слоў, складзіце тэзісны план адказу па тэме «Фарміраванне беларускай народнасці».
4. Падрыхтуйце віртуальную выставу на адну з прапанаваных тэм: «Традыцыйныя беларускія стравы», «Беларускае народнае адзенне», «Танцавальнае мастацтва беларусаў», «Беларускія музычныя інструменты».
5. Вяселле было сапраўдным экзаменам для музыкаў. Існавала традыцыя: калі ігра музыкаў падабалася маладым, нявеста павязвала на музычны інструмент паясок, які быў часткаю вясельнага ўбрання. Потым па колькасці павязаных паяскоў меркавалі пра якасць ігры музыкі і ўсяго ансамбля ў цэлым. А якія вясельныя традыцыі старадаўняга паходжання вядомыя вам? Звярніцеся па дапамогу да сваякоў або скарыстайцеся дадатковымі крыніцамі інфармацыі.